МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

220004, г. Мінск, Калектарная, 10
Тэл. 220-86-87, факс 220-96-84

МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

220004, г. Минск, Коллекторная, 10
Тел. 220-86-87, факс 220-96-84

02.10.2003 №06-04/00446

Вх.№2

Дырэкцыя Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследванняў”

пр-т Пушкіна, 33-186,
220000 г.Мінск

Аб парушэннях заканадаўства.

Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь у ходзе праверкі статутнай дзейнасці Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследванняў» устаноўлены, што гэтае аб'яднанне выкарыстоўвае пячатку, якая не адпавядве патрабаванням Інструкцыі аб парадку адкрыцця і функцыянавання штэмпельна-граверных прадпрыемстваў (участкаў), вырабу, уліку, захоўвання і знішчэння пячатак і штампаў, зацверджанай Пастановай Міністэрства унутраных спраў Рэспублікі Беларусь ад 25.09.2000г. №157.

Акрамя таго, размер эмблемы не адпавядае патрабаванням Дзяржаўнага стандарта Рэспублікі Беларусь СТБ 6.38-95.

З улікам выкладзенага прапануем выправіць адзначаныя недахопы і ў двухтыдневы тэрмін паведаміць аб зробленым Мінюсту Беларусі з дасланнем пратаколу.

Начальнік Упраўлення
грамадскіх аб'яднанняў М.М.Сухінін

Кебікава 223 27 93

Зак. 1702.

27.08.2004 №06-04/809

Дырэкцыя Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследванняў"

вул.Завадская, 4,
г.Фаніпаль, Дзяржынскі раён
Мінскай вобласці

Аб непрадстаўленні інфармацыі і дакументаў

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь (далей – Мінюст) накіравала Дырэкцыі Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследванняў" ліст запытэ ад 02.07.2003 №06-10/00234. Адказ на яго не атрыманы да сённяшняга дня.

Гэтым арганізацыя стварыла Мінюсту перашкоды ў ажыццяўленні ім дзейнасці, прадугледжанай арт.25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях". Такім чынам, у рэгіструючага органа ёсць падставы для вынясення кіруючаму органу грамадскага аб'яднання пісьмовага папярэджання.

Не ажыццяўляючы пакуль што гэты крок, прапануем у тыднёвы тэрмін з дня дастаўкі на юрыдычны адрас дадзенага ліста прадставіць тое, што запрошвалася вышэйназваным запытам.

Што тычыцца дакумента, які пацвярджае наяўнасць памяшкання для юрыдычнага адраса, у дапаўненне да прадстаўленага арганізацыяй раней дагавора на карыстанне памяшканнем трэба даслаць копію старонак тэхнічнага пашпарта на будынак, у якім маецца выдзеленае арганізацыі памяшканне для размяшчэння яе кіруючага органа, з якіх бачны ўласнік названага будынка, а таксама наяўнасць гэтага канкрэтнага памяшкання.
Дадатак: азначаны ліст на 1 арк. у 1 экз.

Выконваючы абавязкі начальніка Упраўлення грамадскіх аб'яднанняў — А.Л.Сліжэўскі

06Харытон 223 27 93
27.08.2004 зап.ін. сац. дасл ед..doc

Харытон
27.08.2004

**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Мінск, Калектарная, 10.
Тэл. 220-86-87, факс 220-96-84

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Минск, Коллекторная, 10.
Тел. 220-86-87, факс 220-96-84

Дорохову В.
Для ответа

10.09.2004 № 06-04/851

На № ____________________

Вх. № 3

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследванняў"

вул.Завадская, 4, 222750,
г.Фаніпаль, Дзяржынскі раён,
Мінская вобл.

Аб прадстаўленні інфармацыі

Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь (далей - Мінюст) установлена, што ў інфармацыйным бюлетэні №10 за 2004 год (стар.3), які выдаецца незарэгістраванай грамадскай арганізацыяй "Партнёрства", надрукавана пэўная інфармацыя, аўтарам якой з'яўляецца Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследванняў" (далей – РГА "НІСЭПД").

Згодна з арт.25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" у тыднёвы тэрмін з дня дастаўкі гэтага ліста на юрыдычны адрас прапануем паведаміць, як магло здарыцца, што РГА "НІСЭПД" ажыццяўляе супрацоўніцтва з незарэгістраваным грамадскім аб'яднаннем.

Акрамя таго, ў гэты ж тэрмін неабходна даслаць копію дадатка 1 да дагавора арэнды памяшкання для юрыдычнага адраса ад 01.12.2003, які з'яўляецца неад'емнай часткай гэтага дагавора, але чамусці не дасланы Мінюсту падчас рэгістрацыі адпаведных змяненняў у Статуце.

Згодна з заяваю РГА "НІСЭПД" яшчэ ад 11.02.2004 №1/02-04 Мінюсту прадстаўлены кантактны тэлефон намесніка дырэктара арганізацыі Саснова А.В. (226 68 73). Па гэтаму ж тэлефону адбылася размова супрацоўніка Мінюста з пасаднай асобай Сасновым А.В. ужо 03.09.2004, які і на гэты раз знаходзіўся па месцы ўстаноўкі названага тэлефоннага нумара. Такім чынам, з сказанага выцякае, што намеснік кіраўніка юрыдычнай асобы знаходзіцца па месцы ўстаноўкі дадзенага тэлефоннага нумара невыпадкова.

Аналіз маючыхся ў Мінюсце дакументаў паказаў, што гэты тэлефонны нумар не мае ніякіх адносін да Саснова А.В. як прыватнай асобы. Ён устаноўлены ў кватэры №50 дома №12, што знаходзіцца па вул.М.Танка, дзе гэтая асоба не пражывае.

Таму прапануем у памянёны тэрмін растлумачыць, як разумець названыя факты.

Мінюстам быў адасланы на юрыдычны адрас арганізацыі запыт ад 27.08.2004 №06-04/809. Аднак, устаноўлены ім тэрмін выйшаў, а запрошанае так і не паступіла. З гэтай нагоды неабходна разам з адказам на вышэйназваныя пытанні прадставіць таксама тлумачэнні адносна таго, чаму так здарылася.

Подпіс асобы, якая падпіша адказ на гэты ліст, трэба засведчыць пячаткаю арганізацыі.

Дадатак: копія стар.3 інфармацыйнага бюлетэня №10 за 2004 год незарэгістраванай грамадскай арганізацыі "Партнёрства" на 1 арк. у 1 экз.

Начальнік Упраўлення грамадскіх аб'яднанняў — М.М.Сухінін

06Харытон 223 27 93
09.09.2004 зап. ін. сац. дасл.-2.doc

МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

220004, г. Мінск, Калектарная, 10.
Тэл. 220-86-87, факс 220-96-84

МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

220004, г. Минск, Коллекторная, 10.
Тел. 220-86-87, факс 220-96-84

18.10.2004. № 06-10/980

На №

Кіруючыя органы грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый

Аб юрыдычных адрасах

У адпаведнасці з арт.8 Жыллёвага кодэксу Рэспублікі Беларусь жылыя памяшканні прызначаюцца для пражывання грамадзян, што сведчыць аб устанаўленні для іх спецыяльнага прававога рэжыму мэтавага выкарыстання. Дапускаецца размяшчэнне кіруючых органаў грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый і іх арганізацыйных структур у аднакватэрных, блакіраваных жылых дамах або іх частцы па ўзгадненню з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Такім чынам, выкарыстанне грамадскім аб'яднаннем, палітычнай партыяй або іх арганізацыйнымі сруктурамі ў якасці свайго юрыдычнага адрасу кватэры ў многакватэрным жылым доме супярэчыць дзеючаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

У сувязі з выкладзеным, калі ў якасці юрыдычнага адрасу аб'яднання (партыі) або яго арганізацыйных структур выкарыстоўваецца кватэра ў многакватэрным жылым доме, просім прывесці юрыдычныя адрасы ў адпаведнасць з патрабаваннямі заканадаўства, для чаго ў тэрмін **да 1 лютага 2005 года** прадставіць рэгіструючым органам неабходныя дакументы для рэгістрацыі змяненняў.

У выпадку невыканання гэтага патрабавання Міністэрства юстыцыі пакідае за сабой права рэагавання згодна дзеючаму заканадаўству.

Міністр В.Р. Галаванаў

МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

220004, г. Мінск, Калектарная, 10.
Тэл. 220-86-87, факс 220-96-84

МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

220004, г. Минск, Коллекторная, 10.
Тел. 220-86-87, факс 220-96-84

22.11.2004 № 06-04/1075

На № 2/10-04 ад 26.10.2004

Ер. №7.

Дырэкцыя
Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў"

вул.Заводская, 4,
222750, г.Фаніпаль,
Дзяржынскі раён,
Мінская вобл.

Адносна пячаткі арганізацыі

Вымушаны яшчэ раз нагадаць, што падчас размовы ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь (далей – Мінюст) з членам кіруючага органа Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў" (далей – РГА "НІСЭПД") Сасновым А.В. 23.09.2004 яму было растлумачана аб неабходнасці прывядзення пячаткі арганізацыі ў адпаведнасць з патрабаваннямі Інструкцыі аб парадку адкрыцця і функцыянавання штэмпельна-гравёрных прадпрыемстваў (участкаў), выраблення, уліку, захоўвання і знішчэння пячатак і штампаў, зацверджанай пастановай Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь ад 25.09.2000 №157. Разам з іншым, у прыватнасці, было падкрэслена, што назва на пячатцы арганізацыі не адпавядае статутнай (у складзе назвы адсутнічае ўказанне на арганізацыйна-прававую форму юрыдычнай асобы). У гэты ж дзень Сасноў А.В. атрымаў пад роспіс ліст ад 23.09.2004 №06-04/902 з такой жа прапановай і канкрэтным тэрмінам яе рэалізацыі.

Аднак, РГА "НІСЭПД" 01.10.2004 прадставіла паведамленне за №1/10-04 ад 01.10.2004 аб тым, што дасылаецца адбітак новай пячаткі. Але на ім зноў жа назва арганізацыі, як і раней, не адпавядае статутнай. Такім чынам, працягваюцца парушэнні патрабаванняў арт.50 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, п.1.1, а таксама п.1.2 Статута і, як следства апошняга, часткі другой арт.4 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях".

З гэтай нагоды арганізацыі лістом яшчэ ад 13.10.2004 №06-04/971 было прапанавана <u>неадкладна</u> прывесці яе ў адпаведнасць з патрабаваннямі заканадаўства. Гэты ліст пад роспіс атрымаў у Мінюсце Сасноў А.В. 21.10.2004.

На жаль, названая праца арганізацыяй не выканана да сённяшняга дня. Больш таго, РГА "НІСЭПД" зрабіла спробу распачаць з Мінюстам перапіску, накіраваную на працяг вышэйназваных парушэнняў з боку арганізацыі. Пры гэтым РГА "НІСЭПД" не улічвае, што яно самастойна распрацавала і прадставіла 11.02.2004 Мінюсту на ўзгадненне такі ўзор пячаткі, якi, як было ў далейшым устаноўлена, не адпавядаў патрабаванням заканадаўства.

З улікам сказанага яшчэ раз прапануем у двухтыднёвы тэрмін з дня дастаўкі гэтага ліста на юрыдычны адрас РГА "НІСЭПД" прадставіць рэгіструючаму органу на ўзгадненне новы ўзор пячаткі. Адначасова інфармуем, што кіраўніцтва Мінюста, ідучы насустрач РГА "НІСЭПД", прыняло рашэнне правесці працу па ўзгадненню адпавядаючага заканадаўству ўзора новай пячаткі без унясення арганізацыяй ў дзяржаўны бюджэт збора за гэтую працу.

Начальнік Упраўлення
грамадскіх аб'яднанняў М.М.Сухінін

06 Харытон 223 27 93
22.11.2004 прап.РГА НІСЭПД.doc

**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Мінск, Калектарная, 10.
Тэл. 220-86-87, факс 220-96-84

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Минск, Коллекторная, 10.
Тел. 220-86-87, факс 220-96-84

16.12.2004 № 06-04/1166

На №

Дырэкцыя
Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў"

вул.Заводская, 4,
222750, г.Фаніпаль,
Дзяржынскі раён,
Мінская вобл.

Аб парушэннях патрабаванняў заканадаўства

У газеце Народная воля (№236 ад 14.12.2004) надрукаваны на першай старонцы пад рубрыкай «Зеркало социологии» артыкул **ад імя** Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў" (далей – РГА "НІСЭПД"). Аднак, як тэкст артыкула, так і подпіс пад ім змяшчаюць скажоную назву памянёнай арганізацыі: у яе складзе адсутнічае ўказанне на арганізацыйна-прававую форму юрыдычнай асобы – словаспалучэнне "рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне".

Гэтым парушаны патрабаванні арт.50 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, п.1.1, а таксама п.1.2 Статута РГА "НІСЭПД" і, як следства апошняга, часткі другой арт.4 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях".

З улікам выкладзенага прапануем запатрабаваць ад рэдакцыі названай газеты публікацыі у бліжэйшы час удакладнення, звязанага з памянёным артыкулам, з дасланнем Міністэрству юстыцыі Рэспублікі Беларусь Праўленнем РГА "НІСЭПД" інфармацыі аб гэтым удакладненні.

Намеснік начальніка
Упраўлення грамадскіх аб'яднанняў А.Л.Сліжэўскі

06 Харытон 223 27 93
16.12.2004 зап. РГА НІСЭПД-4.doc

МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

220004, г. Мінск, Калектарная, 10.
Тэл. 220-86-87, факс 220-96-84

МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

220004, г. Минск, Коллекторная, 10.
Тел. 220-86-87, факс 220-96-84

20.01.2005 № 06-11/59

На №

Дырэкцыя
Рэспубліканскага грамадскага
аб'яднання "Незалежны інстытут
сацыяльна-эканамічных і
палітычных даследаванняў"

вул.Заводская, 4,
222750, г.Фаніпаль,
Дзяржынскі раён,
Мінская вобл.

Аб прадстаўленні дакументаў

У сувязі са службовай неабходнасцю, у адпаведнасці з арт.25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях" прапануем на працягу двух тыдняў з дня дастаўкі гэтага запыта на адрас, што ўказаны ў яго рэквізітах, прадставіць копію альбо арыгінал (ён будзе вернуты пасля завяршэння працы з ім) апошняга нумара бюлетэня «Новости НИСЭПИ», які выдае Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў" (далей – РГА "НІСЭПД").

Акрамя таго, адпаведны дагавор арэнды памяшкання для юрыдычнага адраса дзейнічаў да 31.12.2004. Таму разам з вышэйназваным неабходна даслаць копію дакумента, які мог бы пацвердзіць, што Дырэкцыя РГА "НІСЭПД" па-ранейшаму размяшчаецца у доме №4 па вул. Заводскай у г.Фаніпаль Мінскай вобласці.

Начальнік Упраўлення
грамадскіх аб'яднанняў — А.Л.Сліжэўскі

06 Харытон 223 27 93
20.01.2005 РГА НІСЭПД па бюл. doc

**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ**
**РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Мінск, Калектарная, 10.
Тэл. 200-86-87, факс 200-97-55

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ**
**РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Минск, Коллекторная, 10.
Тел. 200-86-87, факс 200-97-55

23.02.2005 № 06-11/272

На №

Дырэкцыя
Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў"

вул.Заводская, 4,
222750, г.Фаніпаль,
Дзяржынскі раён,
Мінская вобл.

Аб прадстаўленні інфармацыі

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь (далей – Мінюст) лістом ад 28.01.2005 №06-11/75 запрасіла ў Дырэкцыі Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў" (далей – РГА "НІСЭПД") копію анкеты на бумажным носбіце, якая распаўсюджвалася сярод рэспандэнтаў падчас лістападаўскага (2004г.) апытання грамадскай думкі, які названы нацыянальным (як і папярэднія).

Факт правядзення гэтага апытання іменна з дапамогай анкетаў прызнаў намеснік кіраўніка РГА "НІСЭПД" Сасноў А.В. у ходзе судовага працэса, які адбыўся 11.02.2005 з нагоды скаргі арганізацыі. Пры гэтым сп.Сасноў А.В. неаднойчы заяўляў пра тое, што копія гэтай анкеты, як і запрошанай Мінюстам раней, не можа быць прадстаўлена па той прычыне, што ўсе анкеты, з дапамогай якіх праводзіліся названыя інтэрв'ю, знішчаны згодна з загадам дырэктара РГА "НІСЭПД" ад 30.12.2003 №04-03. Адначасова тады ж было сказана пра тое, што пры апытаннях грамадскай думкі ў названыя анкеты для інтэрв'ю не заносіцца імя рэспандэнта.

Мінюст атрымаў адказ на памянёны запыт (яго №2/02-05 ад 14.02.2005). Нягледзячы на названыя вышэй прызнанні сп.Саснова А.В., дадзены ліст фактычна змяшчае адмову прадставіць запрошанае згодна з арт.25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях". Пры гэтым насуперак афіцыйнай інфармацыі, якую агучыў у судовым пасяджэнні сп.Сасноў А.В., у названым адказе арганізацыі падаецца іншае – "пры правядзенні чарговага апытання грамадскай думкі, якое РГА "НІСЭПД" правёў у лістападзе 2004 г., метад анкетавання не прымяняўся, анкеты не выраблялісь і сярод рэспандэнтаў не распаўсюджвалісь".

У сувязі з выкладзеным, кіруючыся арт.25 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб грамадскіх аб'яднаннях”, прапануем паведаміць на працягу тыдня з дня дастаўкі на юрыдычны адрас гэтага ліста:

- дзе была дадзена праўдзівая інфармацыя – ў ходзе вышэйназванага судовага пасяджэння ці ў лісце РГА “НІСЭПД” ад 14.02.2005 №2/02-05?
- якія доказы мае арганізацыя таго, каб мець права называць **усе** свае даследаванні (апытанні грамадскай думкі) нацыянальнымі?

Начальнік Упраўлення
грамадскіх аб'яднанняў А.Л.Сліжэўскі

06 Харытон 203 27 93
23.02.2005 РГА «НІСЭПД» па апыт..doc

2

(8)

**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Калектарная, 10, 220004, г. Мінск
Тел./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

Ул. Коллекторная, 10, 220004, г. Минск
Тел./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

15.07.2005 № 06-11/738

На №

Манаеву А.Ц.

пр-т. Пушкіна, д.33, кв.186,
220000, г.Мінск

Аб запрашэнні ў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь

Як стала вядома Міністэрству юстыцыі Рэспублікі Беларусь (далей – Мінюст), на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзейнічае незарэгістраваная ў Рэспубліцы Беларусь арганізацыя (НІСЭПД).

У сувязі з выкладзеным прапануем наведаць Мінюст на працягу тыдня з дня дастаўкі гэтага ліста на ўказаны вышэй адрас у зручны для Вас час. Дату і час прыбыцця можна ўзгадніць па т.200 62 51 (Сліжэўскі А.Л.).

Начальнік Упраўлення грамадскіх аб'яднанняў — А.Л.Сліжэўскі

06 Харытон 200 70 97
15.07.2005 прап. Манаеву.doc